## Дыктант як від практыкавання: навучальны папераджальны дыктант

Ніхто не будзе аспрэчваць той думкі, што настаўнік (любой дысцыпліны) павінен быць найперш пісьменным. Адна з асноўных задач выкладання беларускай мовы на філалагічных факультэтах у ВНУ педагагічнага профілю – выпрацоўка арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў будучых настаўнікаў. Засваенне арфаграфіі і пунктуацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі забяспечваецца пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм, на ўсіх этапах навучання. Праграмай па сучаснай беларускай літаратурнай мове ў ВНУ, пабудаванай на строга лінейным прынцыпе, не прадуглежана вяртання да вывучанага на папярэднім курсе, нарашчэння тэарэтычнага матэрыялу па адной і той жа тэме на новай ступені навучання. Удасканаленне арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вядзецца, як правіла, на самым пачатку навучання, калі трэба падвысіць пісьменнасць першакурснікаў. Як паказвае практыка, такая праца неабходная і патрабуе паслядоўнасці і сістэматычнасці на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ. Выпрацоўка навыкаў правільнага пісьма дасягаецца праз выкананне разнастайных практыкаванняў, да якіх у працах па лінгваметодыцы адносяць найперш дыктанты.

Дыктант як адзін з самых эфектыўных відаў работы па выпрацоўцы арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў развівае маторна-слыхавыя асацыяцыі навучэнцаў, вучыць успрымаць слова на слых, супастаўляць яго літарны і гукавы склад, замацоўвае арфаэпічныя нормы і здольнасць прымяняць правілы на практыцы.

Агульнавядома, што ўсе дыктанты падзяляюцца ў залежнасці ад мэты правядзення на навучальныя і кантрольныя, ад матэрыялу – на слоўнікавыя і тэкставыя, ад спосабу адлюстравання матэрыялу – на дыктанты без змен і дыктанты са зменамі і інш. У сваю чаргу навучальныя дыктанты ў залежнасці ад часу тлумачэння напісанага падзяляюцца на папераджальныя, тлумачальныя і каменціраваныя. Дыктанты са зменамі ў залежнасці ад спосабаў працы – на выбарачныя і выбарачна-размеркавальныя.

Папераджальны дыктант – гэта такі від дыктанта, пры якім арфаграма ў слове ці пунктаграма ў сказе тлумачыцца пэўным правілам перад запісам. У школьнай практыцы папераджальны дыктант выкарыстоўваецца найчасцей на этапе першаснага замацавання пасля вывучэння пэўнай тэмы. Пры навучанні на філалагічных факультэтах у ВНУ папераджальны дыктант – гэта дыктант, асноўная мэта якога паўтарыць матэрыял, да якога ў працэсе навучання даўно не звярталіся. Сабраныя папераджальныя дыктанты прапануецца выкарыстоўваць менавіта як этап паўтарэння і замацавання арфаграфічных і пунктуацыйных ведаў і навыкаў, што дасць дадатковую магчымасць развіваць названыя здольнасці на ўсім працягу вывучэння курса беларускай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У залежнасці ад успрымання матэрыялу навучальныя дыктанты могуць быць зрокавыя і слыхавыя. Пры зрокавым дыктанце словы або тэкст успрымаюцца зрокава, а пры слыхавым – успрымаюцца на слых. Таму зразумела, што тэкставыя папераджальныя дыктанты прапануецца праводзіць як зрокавыя, а слоўнікавыя – і як зрокавыя, і як слыхавыя. У зрокавых папераджальных дыктантах (у сувязі з тым, што арфаграмы на розныя правілы ўспрымаюцца па-рознаму) спосабы падачы арфаграм розныя: літара або прапускаецца ў слове, або прапануецца выбраць правільны варыянт у дужках і інш. Кожны дыктант суправаджаецца лексіка-стылістычнымі і развіццёвымі заданнямі.

Прапанаваны матэрыял з поспехам можа быць выкарыстаны і настаўнікамі школ на ўроках, на факультатыўных занятках для вучняў сярэдніх і старшых класаў, пры падрыхтоўцы да тэставага кантролю.

1. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Дзесяць гадоў таму назад у Вепрах не было дзяўчыны цікавейшай за Аўгіню цяпер войтаву жонку. В…сёлая жывая дураслівая, свавольніца і першая штукарка на розныя забаўкі і выдумкі – вось якая была Кублікавых Аўгіня. Любіла яна і з дз…цюкамі пажартаваць ды жартавала так што кожнаму з іх здавалася нібы ён і ёсць той на кім запыніла яна сваю дз...вочую ласку.

“Нарвецца дзяўчына” казалі пра яе сталыя жанкі і маладзіцы калі гутаркі пра яе дурас…ці даходзілі да іх вушэй. Аўгіня жартаваць жартавала але граніц у сваіх дурас…цях не/пераступала. Умела быць яна сталаю і сур…ёзнаю і вочы яе цемнаватыя як лёгкі змрок ясных чэрвен…скіх вечароў пазіралі тады строга і ўдумліва. І цяжка было адзначыць колер гэтых вачэй што свяціліся як дз…ве роўныя, прадаўгавата/круглыя ямінкі/багны на цёмным балотным дне ў роспісе пышных раслін. Іх можна было ўспрымаць як карыя вочы чуць/чуць пацягнутыя зелянкаваю павалокаю а часамі яны здаваліся шэравата/зялёнымі. Можа проста мяняліся яны ў залежнасці ад тых думак ад тых маладых мар што поўнілі дз…вочую галаву і гушкалі яе сэрца ў той ці іншы час. Адно можна сказаць пра іх яны вабілі – вось як вабіць воля і радасныя прасторы вясны поўныя музыкі звону і шуму жыцця і зацягвалі як на…рэчная дрыгва дзе звадлівым шэптам гамоняць высокія шумлівыя чароты і пахучы яер.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

* Растлумачце значэнне слова *войт*, *зелянкавы*. Адкажыце, якому тыпу маўлення адпавядае прапанаваны тэкст (апісанню, апавяданню ці разважанню). На якія структурныя часткі падзяляецца тэкст, пра што гаворыцца ў кожнай частцы? Падбярыце да тэксту загаловак. Якія вобразныя сродкі ўжыты ў тэксце?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Была ціхая летняя раніца. Сонца яшчэ не/паспела забрацца высока і пералівалася міл…ёнамі аген…чыкаў у роснай мураве, на палянах, пабліск(ава, ва)ла на вільготным лісці бяроз ра(с, сс)ыпалася залацістымі плямамі праз лапкі галін праз кучомістыя верхавіны хвой. І калі трапляла сонца на спелыя ягады маліны яны гарэлі як камні-самацветы. І пах ад іх ішоў далёка/далёка, праз лес праз балота, да самае лесавое дарогі. Ягады пахлі летам сонцам з…лёнаю муравою палян, ды чым толькі яны (не, ні пахлі)! Знай толькі адно еш, не лянуйся! І Мішка [медзведзяня] стараўся. Спачатку абскубаў ягады лапай еў хапаўся соп, набіваў повен рот малінай разам з лісцем з маленькімі мурашкамі з не/даспелымі ягадамі. Калі ж наеўся стаў больш пераборлівым стаіць прыглядаецца самую спелую ягадзіну выглядае. Выгледзіць маліну на якой сонца больш пераліваецца і нацэліцца паважна языком старанна зліжа ягадзіну і вочы прыжмурыць ад вялікага задавальне(н, нн)я.

Вялікі ласун быў Мішка!

Міхась Лынькоў. “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.

* Адкажыце, якому тыпу маўлення адпавядае тэкст (апісанню, апавяданню ці разважанню). Якія вобразныя азначэнні ўжыты ў тэксце? Патлумачце значэнне слоў *мурава*, *кучомісты.*

3. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Той асе(н, нн)і дзень быў цёплы і пахмурны. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дыванам і нам з сябрам добра было хадзіць па ім варушыць лістоўныя сумёты нагамі і а…чуваць сябе бязбожна шчас…лівымі нягледзячы на лёгкі сум. Таму што мы былі ў Залессі былым маёнтку славутага Міхала Кляофаса Агінскага “паўночных (А, а)фінах” як называлі гэты кут сучаснікі.

Залессе адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы а восень надавала ўсяму што мы бачылі вакол лёгкую паціну чысціні празрыстас…ці і журбы.

Магутныя прысады клёнаў і ліп ішлі да Віллі туліўся ў зарас…ніках старажытны цёплы дом са свечкамі калон ртутна св…ціліся ставы ручай імкнуў праз грэблю. І ва ўсім што вакол была музычнасць ціхая песня: у плёску вады ў шолаху лісця ў парывах ветру які гайдаў палын на мяжы.

Ёсць м…лодыі якія чуеш так часта што пачынаеш грэбаваць імі. Але колькі б ты (не, ні)слухаў палан…зы Агінскага а асабліва вялікі палан..з ля-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мінор (“Развітанне з радзімай”) – ён застанецца блізкі і дарагі твайму сэрцу будзе закранаць у ім самыя глыбі(н, нн)ыя, самыя свае струны.

Уладзімір Караткевіч. “Песня з паўночных Афін”.

* Патлумачце значэнне слоў *пацiна*, *ставы*, *грэбаваць*. Назавіце метафары, ужытыя ў тэксце.

4. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Постаць творцы класічнага беларускага харавога мастацтва знакамітага збірал…ніка даследчыка і прапагандыста помнікаў традыцыйнай культуры беларусаў літаратара культурна/грамадскага дзеяча Рыгора Раманавіча Шырмы пэўна можа быць названа знакавай. Па…ставай такога высокага азначэння яго жыццё ў мастацтве харавога спеву этнамузакалогіі культурна/грамадскай сферы.

Заснаванай і пеставанай без мала паўвека Рыгорам Раманавічам Шырмам (Б, б)еларускай (А, а)кадэмічнай кап…лай былі падараваны суайчы(н, нн)ікам і свету ў найгустоўнейшай трактоўцы маэстра дз..сяткі твораў (Е, е)ўрапейскай музычнай класікі сотні беларускіх народных песен… данес(ен, ян)ых да слухача беражліва з глыбі(н, нн)ым адчуваннем іх н..ўміручай красы. Да прыходу Р.Р. Шырмы харавая культура на Беларусі такой мастацкай вышыні не/дасягала ніколі.

Агульнавядома, справай жыцця Р.Р. Шырмы як фалькларыста/збіральніка публікатара і дырыжора было практычнае выяўленне багацця душы беларускага народа. Перш/наперш для яго духоўнага самасцвярджэння а ў стратэгічным плане – для станаўлення прафесійнай беларускай музыкі на трывалых асновах нацыянальнага меласу.

Арсень Ліс. “Рыгор Шырма: віленскі час”.

* Карыстаючыся слоўнікам, патлумачце значэнні слоў *этнамузыкалогія*, *кап…ла*, *мелас*. Вызначце сферу ўжывання названых слоў.

5. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

У тую (ў, у)рачыстую пера…святочную ноч у глыбінях (Г, г)алактыкі акурат над Завоссем успыхнула калядная зорка Паэта.

Дата яго нараджэ(н, нн)я цяпер значыцца ў кал…ндары UNESKO бо ён Адам Міцкевіч – сусветна/вядомы творца бо ягоны ўнёсак у культуру і асвету дужа важкі гуманістычныя ідэі якімі прасякнута ўся яго літаратурная спадчына працягваюць служыць дабру прагрэсу краса яго высокай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шчымліва/праніклівай паэзіі ў розных кутках свету зачароўвае тых хто любіць мастацкае слова.

Духоўная постаць Адама Міцкевіча заўсёды была і застаецца надта прыкметнаю ў сферы прыгожага піс…менства і прывабнаю. Яго любілі і любяць шанавалі і шануюць розныя народы а заўважалі і заўважаюць найперш іх вялікія сыны. Вельмі высока яго цаніў знакаміты творца палымяны патрыёт Украіны Іван Франко. Богам называў Міцкевіча ў адным з вершаў Яўгені Баратынскі. Заслужанаю і далёка чутаю славаю Міцкевіч карыстаўся яшчэ ў маладыя гады. Як засве…чылі сучаснікі генія (у прыватнасці – Антоні Эдвард Адынец у яго “Піс…мах з падарожжа”) Аляксандр Пушкін сонца рускай паэзіі на адной з вечарын сваіх усклікнуў узрушаны імправізава(н, нн)ем Міцкевіча Які геній! Які свяшчэнны агонь! Што я побач з ім!

Васіль Жуковіч. “Пад зоркаю каляднаю”.

* Патлумачце значэнне слоў *(Г,г)алактыка*, *зорка*. Як разумееце выразы *калядная зорка Паэта*, *сфера прыгожага піс…менства*, *шчымліва/пранікліва паэзія*? Падбярыце сінонімы да слова *ўнёсак*.

6. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Алесь ішоў высокім берагам возера на якім шумелі кашлатыя хвоі. Белы пясок побліз вады быў затканы зялёнымі верасамі. Дзе/нідзе як волаты ахапіўшы чыгу(н, нн)ым вузлаватым карэннем зямлю стаялі дубы. Магутныя і велічныя постаці іх адбіліся ў люстранай вадзе…

Малюнкі прыроды мяняліся адзін за другім. Толькі што ён захапляўся высокім абрывістым берагам як раптам даро…ка што белая ручаінка пакацілася з узгорка на/ніз і перад вачыма яго развінулася бязмежная сенажаць як разаслаў хто вялізны-вялізны дыван што зліваўся ў/далечыні з блакітным шоўкам чэрвен…скага неба. Дзе/нідзе толькі віднеліся на гэтай неабсяжнай зялёнай роўн…дзі асобныя купкі беланогіх бярозак якія стаялі мясцінамі што тыя дзяўчаты ў карагодзе. Зусім на/доле даро…ку перабягаў невялікі ручай які цурчэў з/пад маладой алешыны што ўзнімалася над чаратамі. Вада была такая чыстая з нейкім крыштал…ным а…ценнем што нават круглыя, гладкія камен…чыкі якія ляжалі на дне ручая здаваліся белымі караламі. І хоць Алесю у той час не хацелася піць ён нахіліўся і прыемны халадок асвяжыў яго ўсяго. Пасля падняўся далоняю выцер губы а…трос з кашулі празрыстыя кропелькі і а…чуў што прасвятлела ў вачах. Нават лягчэй цяпер ступалі ногі…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Патлумачце значэнне слоў *кашлаты*, *каралі, развінуцца*. Якія вобразныя сродкі ўжываюцца ў тэксце? Вызначце, да якога тыпу маўлення належыць тэкст. Дайце тэксту загаловак.

7. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

На зямлі ёсць н…мала цудоўных тварэнняў прыроды якія сталі сімваламі цэлых краінаў. Напрыклад, гара (Ф, ф)удзі ў далёкай Японіі, у суседняй Расіі – рака (В, в)олга, а возера (Б, б)алатон адразу нагадвае пра Венгрыю.

Сімвалам жа нашай Беларусі з'яўляецца (Б, б)елавежская (П, п)ушча – бадай, самы вялікі і стары лясны абшар у (Ц, ц)энтральнай Еўропе дзе захаваліся амаль у н…кранутым стане і гонкія аж да воблакаў бары і магутныя векавыя дубы і светлыя б…розавыя гаі і змрочныя нават у сонечныя дні яловыя не(т, д)ры.

Недарэмна хуткаплы(н, нн)ы час у (Б, б)елавежскай (П, п)ушчы спыніўся каб сівая мінуўшчына сустрэлася з днём сё(н, нн)яшнім і заўтрашнім. Тут на/яву трапляеш у казку легенду паданне тут святлееш душою дабрэеш сэрцам зноў пачынаеш верыць у неспакойны чалавечы розум. Нам пад сілу захаваць гэты цудоўны разнастайны свет для будучых пакаленняў людзей. Кожны раз бываючы ў пушчы я быццам замову шапчу радкі з верша Ларысы Геніюш:

Зубр на мох бы ягнё прылёг
Ля бярозаў у белай адзежы
Калі недзе існуе (Б, б)ог
Тут ён пэўна у (Б, б)елавежы.

Уладзімір Ягоўдзік. "(Б, б)елавежская (П, п)ушча".

* Патлумачце значэнне слоў *не(т,д)ры*, *замова*. Якому тыпу маўлення адпавядае тэкст? Дакажыце сваю думку.

8. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Сонца толькі што паказалася з/за сасо(н, нн)іку. Вялікі пунсовы шар імкліва каціўся на/сустрач адзінокай ранішняй хмарцы якая нібы спалохаўшыся што спазнілася хутка падала ў/ніз за далягляд і стаяла там у полымі ўсходу. Полымя гэтае праглынуўшы хмарку паступова бл…днела гасла – ра(с, сс)ейвалася.

Заблішчала раса; пад праменнем сонца маладая рунь і трава сталі алюмініева/белымі, на выгляд – зыркімі і сухімі толькі дзе/нідзе па іх праляглі ярка/зялёныя мокрыя сцежкі – сляды чалавека ці жывёлы. Статак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яшчэ быў на выгане каровы  прагна хапалі ля агароджы траву  незадаволена мычэлі, увішныя цёлкі залазілі ў пасевы. Пастухі крычалі ляскалі пугамі. Радасна віталі новы дзень птушкі звінелі ў вышыні жаваранкі мітусіліся каля шпакоўніц у садах і над стрэхамі шпакі і няспы(н, нн)а лёталі то высока ў небе то над самай з…млёй імклівыя ластаўкі.

Іван Шамякін. “У добры час”.

* Падбярыце сінонімы да слоў *пунсовы*, *зыркі*, *увішны*. Падбярыце да тэксту загаловак. Вызначце стыль тэксту. Абгрунтуйце вывад.

9. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Дол быў ус…ланы рудым лісцем сухой рыжай папара(ц, цц)ю доўгаю пераблытанаю як іржавы дрот травою друзам збуц…велых галінак. З/пад гэтай перапрэлай за многія гады коўдры сям/там прагляд(ыва, ва)ў бледны як вымачаны мох крывыя сцяблінкі ягадніку. Вострымі зялёнымі шпількамі тырчала маладая травічка.

Дрэвы яшчэ не распусціліся былі брудна/шэрыя і рэзка вырысоўваліся на фоне густой зеляніны маладога ельніку. Вербалоз толькі што ра…пусціў свае каткі, над ім бзынкалі першыя смелыя чмялі. На арэшніку можна было заўважыць  на пупышках далікатныя ружовенькія вусікі цвету. Каткі – распушаныя, толькі дакраніся да іх – асыпаліся на зямлю сеючы ледзь прыкметны пылок. З пупышкаў на бярозе  вось/вось гатовы былі паказацца маладыя лісточкі але бяроза нешта марудзіла – мо чакала пакуль пройдуць в…сеннія такія непатрэбныя але немінучыя халады. Можа гэтую асцярожнасць яна пераняла ад дуба бо той усё (не, ні)як  (не, ні) асмельваўся скінуць сваё старое пажоўклае ўбранне усё чакаў пакуль добра ўгрэе сонца і адыдзе ад холаду карэнне.

Дуб не спяшаўся бо па небе яшчэ снавалі як н…вылінялыя пасля зімы каровы на пашы  непрыветлівыя кудлатыя хмары. З іх на/дол ледзь чутна шапочучы сыпаўся часам дробны як крупы  сн…жок. І тады яшчэ больш цягнула холадам ад сырых лагчын ад зацен(ен, ян)ых густымі елкамі, яшчэ з астаткамі наздраватага лядку, упадзін хоць на дварэ быў ужо канец красавіка.

Уладзімір Дамашэвіч. “Між двух агнёў”.

* Падбярыце сінонімы да слоў *збуц…велы*, *далікатны*, *снаваць*, *бзынкаць*. Падкрэсліце параўнальныя канструкцыі, ужытыя ў тэксце.

10. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы  згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сучасныя дзеці, асабліва гарадскія, амаль адарваныя ад (Б, б)еларускай народнай культуры. У сялянскай хаце аніводная рэч аніводны прадмет убранства ці адзення не мог узнікнуць па/за межамі традыцыйнага мастацтва. Рушнікі посцілкі сурвэткі фіранкі тканае і аздобленае вышыўкай а(п, пп)лікацыяй вязанымі карункамі адзенне гліняны посуд ра…пісныя дываны скрыні прыгажосць раз…бы на шафе калаўроце ці аканіцах кованыя клямкі і завесы саламяныя брылі ці павукі на шчасце пад столлю усё гэта былі высока/мастацкія рэчы а між тым адначасова і звычайныя неабходныя кожны час кожны дзень усё жыццё. Створаныя па строгіх канонах выпрабаваных стагоддзямі яны разам з песнямі казкамі святамі з маленства выхоўвалі густ і пачуццё прыгажос…ці а потым навучалі і саміх дзяцей як зрабіць усё гэта хараство сваімі рукамі.

Беларусам французам эстонцам чалавека робіць асяро(дз, ддз)е – ма…чына мова, бацькава хата, родны горад першая казка кніга лялька. Ніводны чалавек не народзіцца адразу з пачуццём што ён японец фін або рускі. Менавіта ў дзяцінстве закладаецца падмурак разумення сувязі са сваім народам з пэўнаю часткаю Зямлі – з (Б, б)ацькаўшчынай.

Таццяна Церашковіч. “Лялька беларуская”.

* Растлумачце значэнне слоў *фіранкі*, *караўрот*, *аканіцы*, *клямка*. Да якога тыпу маўлення і стылю належыць тэкст? Дакажыце сваю думку.

11. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Для турыстаў Рым гэта горад/музей. Вуліцы будынкі плошчы горада захоўваюць шмат помнікаў мінулага. І адзін з такіх самых цікавых помнікаў у Рыме вядома (К, к)алізей старажытны цырк або тэатр на пяцьдз...сят тысяч месцаў. Восемдз...сят арак з’яўляюцца выхадамі на арэну дзе вялі баі глады...тары і людзі ўступалі ў бара...ьбу з дзікімі звярамі.

Цяжка перадаць словамі ўражанне якое пакідаюць рэшткі гэтага гранды...знага збудавання. Чырвоная цэгла трыбун (К, к)алізея пашчапаная быццам асколкамі снарадаў здаецца да сёння хавае ў сабе дыханне соцен... тысяч людзей якія некалі збіраліся сюды каб падзівіцца на жорсткія відовішчы. Велічная цішыня вячэрняга (К, к)алізея і паў/змрок што ахутвае яго яшчэ больш падкрэсліваюць гранды...знасць намераў і нейкую паэтычную чароўнасць старажытнага помніка.

Нашы погляды прыцягваюць і сучасныя малюнкі бо цяпер вячэрні (К, к)алізей і месца спаткання закаханых і месца дзе начуюць бяздомныя.

Лідзія Арабей. “Вакол Еўропы”.

* Падбярыце сінонімы да слова *чароўнасць*. Абгрунтуйце ўжыванне спалучэння *да сёння* замест *да сённяшняга дня*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Брылёўскае слова моцнае не толькі сваёй сэнсавай дакладнасцю і лірычнай напоўненасцю але і смехам -- то знішчальна/здзеклівым то жартаўліва/...смешлівым а то іранічна/з...едлівым.

Цвярозы вясёлы розум Брыля не прымае дроб...знай зласлівасці і н...добрай затоенасці і выводзіць усё ...лжывае і бязглуздае на паверхню скрытае робіць а...крытым падымае заслону над тым што можа жыць толькі ў цен(і, ю), як мага далей ад святла дабрыні і праўды. Можна нават сказаць што ў творчасці піс...менніка смяецца сам жанр міні...цюр на якім ён спыніў свой позірк і які палюбіў у апошняе дзесяціго(дз, ддз)е.

Ужываючы слоўны тэкст сумуючы і радуючыся з дапамогай слова перад чытачом устае ў сваім выяўным не/замаскіраваным аблі(ч, чч)ы (ні, не)хто іншы, як сам аўтар. І мы ўдзячныя яму за шчырасць і тады калі ён выступае ў ролі зана...та прыдзірлівага старога і тады калі ён паўстае перад намі ў ролі чалавека які паводле слоў паэта “прышчык да ва(н, нн)ы і цёплых галёш”.

Міхась Тычына. “Вялікія клопаты малой прозы”.

* Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Растлумачце сэнс выразу *смяецца сам жанр міні...цюр*.

13. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Чалавечае жыццё дзіўная р...знакаляровая стужка лёсу што паступова раскручваецца ў невядомую будучыню пакідаючы ў гісторыі планеты (З, з)ямля свае адметныя сляды. Некаторыя з іх бачацца з другіх ма...ерыкоў і краін іншыя толькі ў той мясцовасці дзе наканавана было чалавеку нарадзіцца жыць ствараць.

У вёсц... Бог даў мне ма...чымасць спасцігнуць прыгажосць прыроды і праваднікамі ў гэтым былі мае дзед і бабуля – мам...ны бацькі. Чым больш набірае...ся вопыту і чым далей адыходзіць час іх зыход... ў іншы свет тым выяўней адчуваеш і разумееш наколькі духоўна багатыя д...лікатныя і можна сказаць святыя былі гэтыя простыя в...сковыя людзі. Зараз мне здаецца што яны былі ўвасабленнем усіх найлепшых якасцей беларусаў працавітасці, спако..., памяркоўнасці, такт..., с(а, у)перажывання. Ці (не, ні) таму ў іх хаце часта спыняліся госці -- і простыя в...скоўцы і на...укоўцы і кіраўнікі і ўсе яны з павагай і любо...ю ставіліся да гаспадароў.

Ігар Пракаповіч. “Зачараваны краем чароўным”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Да якога тыпу  маўлення і стылю належыць тэкст? Дакажыце сваю думку. Падбярыце сінонімы і антонімы да слова *д...лікатныя*.

14. Прачытайце тэкст, называючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Патлумачце іх правапіс і пастаноўку. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

Я стаю на/ўзбоч і праз адлегласць часу ўчэпістай дзіцячай памяццю чую ўвекавечанае ў душу набліжанае в...ртаннем у маленства грознае грукатанне гром..., пад раптоўным зыркім святлом маланкі бачу бясконцую няспынна/хваліста/хісткую шырыню жытнёвага поля (у маленстве ўсё здаецца на/шмат большым уражлівым і аб...ёмістым), схіл(е,і)ныя дажджом абцяжараныя буйным зернем каласы якія горнуцца да прамытых дажджынкамі блакітных вочак васількоў/валошак нібыта глядзяцца ў іх.

Чую саладкаваты пах ва...кіх жытнёвых снапоў якія покатам ляжаць на густым ...ржышчы і якія я малалетак спрабую па...цягваць у кучу. З прыемнай натруджанасцю зносіў я і нажатыя мамай жмені склад(ыва, ва)ючы іх на перавясла якім туга звязвае яна сноп за снопам. Не баяўся я і калючага ...ржышча то высокага дзе зелянееецца трава бо яго трэба было скасіць на зіму карове (і як яна ела гэткую саламя(н, нн)ую цвердзь?), то зусім нізен...кага калі прыходзіў брыга...ір з праверкай і хваліў маму за такую прылежнасць.

Анатоль Бутэвіч. “А я ў Баяры, дамоў хачу...”

* Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце адказ. Растлумачце значэнне слова *зыркі*. Якія вобразныя сродкі ўжыты ў тэксце?

15. Прачытайце тэкст. Назавіце прапушчаныя арфаграмы і пунктаграмы. Сфармулюйце правілы. Спішыце тэкст, афармляючы згодна з правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Варта на імгненне азірнуцца назад -- і ў памяці нібы ў калейдаскоп... замільгаюць прывідныя абрыўкі і лахманы даўніх падзей і здарэнн...ў пачнуць прыпамінацца асобныя выпа...кі з дзяцінства і юнацтва згад(ыва, ва)цца эпізоды са сталых гадоў ды склад(ыва, ва)цца ў адпаведную карціну.

Пачнеш перабіраць жыццёвыя драбніцы, хоць яны былі даўным/даўно і на першы план выплыве родная вёска (К, к)упленка дзе нарадзіўся і вырас што лепіцца на пагорку, на/во(д, дд)аль ад рачулкі (М, м)ясрэды цераз якую перакінуты вузен...кі масток засланы сасновымі плашкамі.

Па адзін канец вёскі вуліца выходзіла на дарогу што ныралa ў ст...гадовы сасновы лес і ра(с, сс)оўваючы яго на бакі бегла да мястэчка. Местачкоўцы ганарыліся сваёй культурай тут мелася свая інтэл...генцыя педагогі брыгадзіры рахункаводы. Яны больш дбайна апраналіся і стараліся размаўляць па/гара(дс, ц)кому вымаўляючы тутэйшыя архаізмы з чужым акцэнтам і траплялі часам у на...та камічнае становішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Васіль Макарэвіч. “Дарогай веку”.

* Падбярыце да тэксту загаловак. Растлумачце значэнне слова *плашка* і выразу *лахманы падзей*.

16. Растлумачце правапіс падкрэсленых арфаграм. Запішыце пад дыктоўку.

Колас, калоссе, парэа, ода, ёд, вёска, лядок, яліна, герой, дабрадзей, дабрабыт, добразычлівы, шэравокі, асновапалажэнне, радыёстанцыя, радыеактыўнасць, падысці, прыйсці, безыдэйна, перайсці, на ўвесь голас, з усёй моцы, неба ўлетку, траур, паўза, няма унтаў, шаўковы, рыбка, важкі, хлеб, казка, магчы, даведка, сядзь, вадзяны, ліцвін, дзверы, віцязь, каратэ, Алесеў сад, Божая Маці, барані божа, Багдановічаў зборнік, бальзакаўскі ўзрост, Купалаўская прэмія, купалаўскія вершы, кашнэ, дэфіле.

* Растлумачце значэнне слоў *дабрадзей, ода, кашнэ, дэфіле*. Як вы разумееце выраз *бальзакаўскі ўзрост*?

17. Прачытайце словы (спалучэнні слоў, словазлучэнні), называючы патрэбную літару. Растлумачце правапіс, запішыце.

Дапам…жнік, дапам…гчы, ц…мны, ц…мнаваты, в(е, я)сёлы, в…с…лосць, скар…ход, в…гнетрывалы, біблі(о, ё)граф, біблі(а, я)графія, рады…грама, рады…хімія, с…граць, за…сці, аб…сці, вы…граць, …мклівы, па…мкнуцца, на …льдзіне, …льнозавод, мог (у, ў)зяць, магла (у, ў)зяць, фра(у, ў), на (У, Ў)рале, кла(д, т)ка, ха(дзь, ць)ба, фу…бол, дзя(дз, ц)ька, ха(т, ц)іна, мядзве(дзь, ць), (ц, т)юль, раздаро(ж, жж)а, гру(п, пп)а, прая(здн, зн)ы, кампо(стн, сн)ы, аген…чык, мален…кі, (С, с)карынавы выданні, (Б, б)ожы суд, (А, а)лах з ім, рэзюм…, пік(э, е), (Іа, Іо)ркшыр, (Іа, Іо)ан, на …ржышчы, вакол …ржышча, за…очны, за…азёрны, за…облачны.

* З 3 словамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

## Даведка

1. Дзесяць гадоў таму назад у Вепрах не было дзяўчыны цікавейшай за Аўгіню цяпер войтаву жонку. Вясёлая, жывая, дураслівая, свавольніца і першая штукарка на розныя забаўкі і выдумкі – вось якая была Кублікавых Аўгіня. Любіла яна і з дзецюкамі пажартаваць, ды жартавала так, што кожнаму з іх здавалася, нібы ён і ёсць той, на кім запыніла яна сваю дзявочую ласку.

“Нарвецца дзяўчына” , -- казалі пра яе сталыя жанкі і маладзіцы, калі гутаркі пра яе дурасці даходзілі да іх вушэй. Аўгіня жартаваць жартавала, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

граніц у сваіх дурасцях не пераступала. Умела быць яна сталаю і сур’ёзнаю, і вочы яе, цемнаватыя, як лёгкі змрок ясных чэрвеньскіх вечароў, пазіралі тады строга і ўдумліва. І цяжка было адзначыць колер гэтых вачэй, што свяціліся, як дзве роўныя, прадаўгавата-круглыя ямінкі-багны на цёмным балотным дне ў роспісе пышных раслін. Іх можна было ўспрымаць як карыя вочы, чуць-чуць пацягнутыя зелянкаваю павалокаю, а часамі яны здаваліся шэравата-зялёнымі. Можа проста мяняліся яны ў залежнасці ад тых думак, ад тых маладых мар, што поўнілі дзявочую галаву і гушкалі яе сэрца ў той ці іншы час. Адно можна сказаць пра іх: яны вабілі – вось як вабіць воля і радасныя прасторы вясны, поўныя музыкі звону і шуму жыцця, і зацягвалі, як надрэчная дрыгва, дзе звадлівым шэптам гамоняць высокія шумлівыя чароты і пахучы яер.

Якуб Колас. “Дрыгва”.

2. Была ціхая летняя раніца. Сонца яшчэ не паспела забрацца высока і пералівалася мільёнамі агеньчыкаў у роснай мураве, на палянах, паблісквала на вільготным лісці бяроз, рассыпалася залацістымі плямамі праз лапкі галін, праз кучомістыя верхавіны хвой. І калі трапляла сонца на спелыя ягады маліны, яны гарэлі як камні-самацветы. Пах ад іх ішоў далёка-далёка, праз лес, праз балота, да самае лесавое дарогі. Ягады пахлі летам сонцам зялёнаю муравою палян, ды чым толькі яны не пахлі! Знай толькі адно: еш, не лянуйся! І Мішка [медзведзяня] стараўся. Спачатку абскубаў ягады лапай, еў, хапаўся, соп, набіваў повен рот малінай разам з лісцем, з маленькімі мурашкамі, з недаспелымі ягадамі. Калі ж наеўся, стаў больш пераборлівым: стаіць, прыглядаецца, самую спелую ягадзіну выглядае. Выгледзіць маліну, на якой сонца больш пераліваецца, і нацэліцца паважна языком, старанна зліжа ягадзіну і вочы прыжмурыць ад вялікага задавальнення.

Вялікі ласун быў Мішка!

Міхась Лынькоў. “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Той восенні дзень быў цёплы і пахмурны. Лісце ляжала пад нагамі тоўстым стракатым дыванам, і нам з сябрам добра было хадзіць па ім, варушыць лістоўныя сумёты нагамі і адчуваць сябе бязбожна шчаслівымі, нягледзячы на лёгкі сум. Таму што мы былі ў Залессі, былым маёнтку славутага Міхала Кляофаса Агінскага, “паўночных Афінах”, як называлі гэты кут сучаснікі.

Залессе – адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы, а восень надавала ўсяму, што мы бачылі вакол, лёгкую паціну чысціні празрыстасці і журбы.

Магутныя прысады клёнаў і ліп ішлі да Віллі, туліўся ў зарасніках старажытны цёплы дом са свечкамі калон, ртутна свяіліся ставы, ручай імкнуў праз грэблю. І ва ўсім, што вакол, была музычнасць, ціхая песня: у плёску вады, у шолаху лісця, у парывах ветру, які гайдаў палын на мяжы.

Ёсць мелодыі, якія чуеш так часта, што пачынаеш грэбаваць імі. Але колькі б ты ні слухаў паланэзы Агінскага, а асабліва вялікі паланэз ля-мінор

(“Развітанне з радзімай”) – ён  застанецца блізкі і дарагі твайму сэрцу, будзе закранаць у ім самыя глыбінныя, самыя свае струны.

Уладзімір Караткевіч. “Песня з паўночных Афін”.

4. Постаць творцы класічнага беларускага харавога мастацтва, знакамітага збіральніка, даследчыка і прапагандыста помнікаў традыцыйнай культуры беларусаў, літаратара, культурна-грамадскага дзеяча Рыгора Раманавіча Шырмы, пэўна, можа быць названа знакавай. Падставай такога высокага азначэння – яго  жыццё ў мастацтве харавога спеву, этнамузакалогіі, ку льтурна-грамадскай сферы.

Заснаванай і пеставанай без мала паўвека Рыгорам Раманавічам Шырмам Беларускай  акадэмічнай капэлай былі падараваны суайчыннікам і свету ў найгустоўнейшай трактоўцы маэстра дзесяткі твораў  еўрапейскай музычнай класікі, сотні беларускіх народных песень, данесеных да слухача беражліва,  з глыбінным адчуваннем іх неўмiручай красы. Да прыходу Р.Р. Шырмы харавая культура на Беларусі такой мастацкай вышыні не дасягала ніколі.

Агульнавядома, справай жыцця Р.Р. Шырмы як фалькларыста-збіральніка, публікатара і дырыжора было практычнае выяўленне багацця душы беларускага народа. Перш-наперш для яго духоўнага самасцвярджэння, а  ў стратэгічным плане – для станаўлення прафесійнай беларускай музыкі на трывалых асновах нацыянальнага меласу.

Арсень Ліс. “Рыгор Шырма: віленскі час”.

5. У тую ўрачыстую перадсвяточную ноч у глыбінях  галактыкі акурат над Завоссем успыхнула калядная зорка Паэта.

Дата яго нараджэння цяпер значыцца ў календары UNESKO, бо ён, Адам Міцкевіч,– сусветна-вядомы творца, бо ягоны ўнёсак у культуру і асвету дужа важкі, гуманістычныя ідэі, якімі прасякнута ўся яго літаратурная спадчына, працягваюць служыць дабру, прагрэсу, краса яго высокай шчымліва-праніклівай паэзіі ў розных кутках свету зачароўвае тых, хто любіць мастацкае слова.

Духоўная постаць Адама Міцкевіча заўсёды была і застаецца надта прыкметнаю ў сферы прыгожага пісьменства і прывабнаю. Яго любілі і любяць, шанавалі і шануюць розныя народы, а заўважалі і заўважаюць найперш іх вялікія сыны. Вельмі высока яго цаніў знакаміты творца, палымяны патрыёт Украіны Іван Франко. Богам называў Міцкевіча ў адным з вершаў Яўгені Баратынскі. Заслужанаю і далёка чутаю славаю Міцкевіч карыстаўся яшчэ ў маладыя гады. Як засведчылі сучаснікі генія (у прыватнасці – Антоні Эдвард Адынец у яго “Пісьмах з падарожжа”) Аляксандр Пушкін, сонца рускай паэзіі, на адной з вечарын сваіх усклікнуў, узрушаны імправізаваннем Міцкевіча: “Які геній! Які свяшчэнны агонь! Што я побач з ім!”

Васіль Жуковіч. “Пад зоркаю каляднаю”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Алесь ішоў высокім берагам возера, на якім шумелі кашлатыя хвоі. Белы пясок побліз вады быў затканы зялёнымі верасамі. Дзе-нідзе, як волаты, ахапіўшы чыгунным вузлаватым карэннем зямлю стаялі дубы. Магутныя і велічныя постаці іх адбіліся ў люстранай вадзе…

Малюнкі прыроды мяняліся адзін за другім. Толькі што ён захапляўся высокім абрывістым берагам, як раптам дарожка, што белая ручаінка, пакацілася з узгорка на ніз, і перад вачыма яго развінулася бязмежная сенажаць, як разаслаў хто вялізны-вялізны дыван, што зліваўся ўдалечыні з блакітным шоўкам чэрвеньскага неба. Дзе-нідзе толькі віднеліся на гэтай неабсяжнай зялёнай роўнядзі асобныя купкі беланогіх бярозак, якія стаялі мясцінамі, што тыя дзяўчаты ў карагодзе. Зусім на доле дарожку перабягаў невялікі ручай, які цурчэў з-пад маладой алешыны, што ўзнімалася над чаратамі. Вада была такая чыстая, з нейкім крыштальным адценнем, што нават круглыя, гладкія каменьчыкі, якія ляжалі на дне ручая, здаваліся белымі караламі. І хоць Алесю у той час не хацелася піць, ён нахіліўся, і прыемны халадок асвяжыў яго ўсяго. Пасля падняўся, далоняю выцер губы, абтрос з кашулі празрыстыя кропелькі і адчуў, што прасвятлела ў вачах. Нават лягчэй цяпер ступалі ногі…

Пятрусь Броўка. “Калі зліваюцца рэкі”.

7. На зямлі ёсць нямала цудоўных тварэнняў прыроды, якія сталі сімваламі цэлых краінаў. Напрыклад, гара Фудзі ў далёкай Японіі, у суседняй Расіі – рака Волга, а возера Балатон адразу нагадвае пра Венгрыю.

Сімвалам жа нашай Беларусі з’яўляецца Белавежская пушча – бадай, самы вялікі і стары лясны абшар у цэнтральнай Еўропе, дзе захаваліся амаль у некранутым стане і гонкія аж да воблакаў бары, і магутныя векавыя дубы, і светлыя бярозавыя гаі, і змрочныя нават у сонечныя дні яловыя нетры.

Недарэмна хуткаплынны час у Белавежскай пушчы спыніўся, каб сівая мінуўшчына сустрэлася з днём сённяшнім і заўтрашнім. Тут наяву трапляеш у казку, легенду, паданне, тут святлееш душою, дабрэеш сэрцам, зноў пачынаеш верыць у неспакойны чалавечы розум. Нам пад сілу захаваць гэты цудоўны разнастайны свет для будучых пакаленняў людзей. Кожны раз, бываючы ў пушчы, я ,быццам замову, шапчу радкі з верша Ларысы Геніюш:

Зубр на мох, бы ягнё, прылёг
Ля бярозаў у белай адзежы.
Калі недзе існуе Бог,
Тут ён пэўна у Белавежы.

Уладзімір Ягоўдзік. “Белавежская пушча”.

8. Сонца толькі што паказалася з-за сасонніку. Вялікі пунсовы шар імкліва каціўся насустрач адзінокай ранішняй хмарцы, якая, нібы спалохаўшыся, што спазнілася, хутка падала ўніз, за далягляд, і стаяла там у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

полымі ўсходу. Полымя гэтае, праглынуўшы хмарку, паступова бляднела гасла – ра ссейвалася.

Заблішчала раса; пад праменнем сонца маладая рунь і трава сталі алюмініева-белымі, на выгляд – зыркімі і сухімі, толькі дзе-нідзе па іх праляглі ярка-зялёныя мокрыя сцежкі – сляды чалавека ці жывёлы. Статак яшчэ быў на выгане, каровы прагна хапалі ля агароджы траву, незадаволена мычэлі, увішныя цёлкі залазілі ў пасевы. Пастухі крычалі, ляскалі пугамі. Радасна віталі новы дзень птушкі: звінелі ў вышыні жаваранкі, мітусіліся каля шпакоўніц у садах і над стрэхамі шпакі і няспынна лёталі то высока ў небе, то над самай зямлёй імклівыя ластаўкі.

Іван Шамякін. “У добры час”.

9. Дол быў услань рудым лісцем, сухой рыжай папараццю, доўгаю, пераблытанаю, як іржавы дрот, травою, друзам збуцвелых галінак. З-пад гэтай перапрэлай за многія гады коўдры сям-там праглядваў бледны, як вымачаны, мох, крывыя сцяблінкі ягадніку. Вострымі зялёнымі шпількамі тырчала маладая травічка.

Дрэвы яшчэ не распусціліся, былі брудна-шэрыя і рэзка вырысоўваліся на фоне густой зеляніны маладога ельніку. Вербалоз толькі што распусціў свае каткі, над ім бзынкалі першыя смелыя чмялі. На арэшніку можна было заўважыць на пупышках далікатныя ружовенькія вусікі цвету. Каткі – распушаныя, толькі дакраніся да іх – асыпаліся на зямлю, сеючы ледзь прыкметны пылок. З пупышкаў на бярозе вось-вось гатовы былі паказацца маладыя лісточкі, але бяроза нешта марудзіла – мо чакала, пакуль пройдуць вясеннія, такія непатрэбныя, але немінучыя халады. Можа, гэтую асцярожнасць яна пераняла ад дуба, бо той усё ніяк не асмельваўся скінуць сваё старое пажоўклае ўбранне ,усё чакаў, пакуль добра ўгрэе сонца і адыдзе ад холаду карэнне.

Дуб не спяшаўся, бо па небе яшчэ снавалі, як нявылінялыя пасля зімы каровы на пашы, непрыветлівыя кудлатыя хмары. З іх на дол, ледзь чутна шапочучы, сыпаўся часам дробны, як крупы, сняжок. І тады яшчэ больш цягнула холадам ад сырых лагчын, ад зацененых густымі елкамі, яшчэ з астаткамі наздраватага лядку, упадзін, хоць на дварэ быў ужо канец красавіка.

Уладзімір Дамашэвіч. “Між двух агнёў”.

10. Сучасныя дзеці, асабліва гарадскія, амаль адарваныя ад беларускай народнай культуры. У сялянскай хаце аніводная рэч, аніводны прадмет убранства ці адзення не мог узнікнуць па-за межамі традыцыйнага мастацтва. Рушнікі, посцілкі, сурвэткі, фіранкі, тканае і аздобленае вышыўкай, аплікацыяй, вязанымі карункамі адзенне, гліняны посуд, распісныя дываны, скрыні, прыгажосць разьбы на шафе, калаўроце ці аканіцах, кованыя клямкі і завесы, саламяныя брылі ці павукі на шчасце пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

столлю – усё гэта былі высокамастацкія рэчы, а між тым адначасова і звычайныя, неабходныя кожны час, кожны дзень усё жыццё. Створаныя па строгіх канонах, выпрабаваных стагоддзямі, яны разам з песнямі, казкамі, святамі з маленства выхоўвалі густ і пачуццё прыгажосці, а потым навучалі і саміх дзяцей, як зрабіць усё гэта хараство сваімі рукамі.

Беларусам, французам, эстонцам, чалавека робіць асяроддзе – матчына мова, бацькава хата, родны горад, першая казка, кніга, лялька. Ніводны чалавек не нараджаецца адразу з пачуццём, што ён японец фін або рускі. Менавіта ў дзяцінстве закладаецца падмурак разумення сувязі са сваім народам, з пэўнаю часткаю Зямлі – з Бацькаўшчынай.

Таццяна Церашковіч. “Лялька беларуская”.

11. Для турыстаў Рым – гэта горад-музей. Вуліцы, будынкі, плошчы горада захоўваюць шмат помнікаў мінулага. І адзін з такіх самых цікавых помнікаў у Рыме, вядома, Калізей – старажытны цырк або тэатр на пяцьдзясят тысяч месцаў. Восемдзесят арак з’яўляюцца выхадамі на арэну, дзе вялі баі гладыятары і людзі ўступалі ў барацьбу з дзікімі звярамі.

Цяжка перадаць словамі ўражанне, якое пакідаюць рэшткі гэтага грандыёзнага збудавання. Чырвоная цэгла трыбун Калізея, пашчапаная, быццам асколкамі снарадаў, здаецца, да сёння хавае ў сабе дыханне соцень тысяч людзей, якія некалі збіраліся сюды, каб падзівіцца на жорсткія відовішчы. Велічная цішыня вячэрняга Калізея і паўзмрок, што ахутвае яго, яшчэ больш падкрэсліваюць грандыёзнасць намераў і нейкую паэтычную чароўнасць старажытнага помніка.

Нашы погляды прыцягваюць і сучасныя малюнкі, бо цяпер вячэрні Калізей – і месца спатканняў закаханых, і месца, дзе начуюць бяздомныя.

Лідзія Арабей. “Вакол Еўропы”.

12. Брылёўскае слова моцнае не толькі сваёй сэнсавай дакладнасцю і лірычнай напоўненасцю, але і смехам, то знішчальна-здзеклівым, то жартаўліва-ўсмешлівым, а то іранічна-з’едлівым.

Цвярозы, вясёлы розум Брыля не прымае дробязнай зласлівасці і нядобрай затоенасці і выводзіць усё лжывае і бязглуздае на паверхню, скрытае робіць адкрытым, падымае заслону над тым, што можа жыць толькі ў цені, як мага далей ад святла дабрыні і праўды. Можна нават сказаць, што ў творчасці пісьменніка смяецца сам жанр мініяцюр, на якім ён спыніў свой позірк і які палюбіў у апошняе дзесяцігоддзе.

Ужываючы слоўны тэкст, сумуючы і радуючыся з дапамогай слова, перад чытачом устае ў сваім выяўным, незамаскіраваным аблічча не хто іншы, як сам аўтар. І мы ўдзячныя яму за шчырасць і тады, калі ён выступае ў ролі занадта прыдзірлівага старога, і тады, калі ён паўстае перад намі ў ролі чалавека, які, паводле слоў паэта, “прывык да ванны і цёплых галёш”.

Міхась Тычына. “Вялікія клопаты малой прозы”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Чалавечае жыццё – дзіўная рознакаляровая стужка лёсу, што паступова раскручваецца ў невядомую будучыню, пакідаючы ў гісторыі планеты Зямля свае адметныя сляды. Некаторыя з іх бачацца з другіх мацерыкоў і краін, іншыя – толькі ў той мясцовасці, дзе наканавана было чалавеку нарадзіцца, жыць, ствараць.

У вёсцы Бог даў мне магчымасць спасцігнуць прыгажосць прыроды, і праваднікамі ў гэтым былі мае дзед і бабуля – маміны бацькі. Чым больш набіраешся вопыту і чым далей адыходзіць час іх зыходу ў іншы свет, тым выяўней адчуваеш і разумееш, наколькі духоўна багатыя, далікатныя і, можна сказаць, святыя былі гэтыя простыя вясковыя людзі. Зараз мне здаецца, што яны былі ўвасабленнем усіх найлепшых якасцей беларусаў: працавітасці, спакою, памяркоўнасці, такту, суперажывання. Ці не таму ў іх хаце часта спыняліся госці – і простыя вяскоўцы, і навукоўцы, і кіраўнікі, і ўсе яны з павагай і любоўю ставіліся да гаспадароў.

Ігар Пракаповіч. “Заваблены краем чароўным”.

14. Я стаю наўзбоч і праз адлегласць часу ўчэпістай дзіцячай памяццю чую ўвекавечанае ў душу, набліжанае вяртаннем у маленства грознае грукатанне грому, пад раптоўным зыркім святлом маланкі бачу бясконцую няспынна-хвалiста-хісткую шырыню жытнёвага поля (у маленстве ўсё здаецца нашмат большым, уражлівым і аб’ёмістым), схіленыя дажджом, абцяжараныя буйным зернем каласы, якія горнуцца да прамытых дажджынкамі блакітных вочак васількоў-валошак, нібыта глядзяцца ў іх.

Чую саладкаваты пах важкіх жытнёвых снапоў, якія покатам ляжаць на густым іржышчы і якія я, малалетак, спрабую падцягваць у кучу. З прыемнай натруджанасцю зносіў я і нажатыя мамай жмені, складваючы іх на перавясла, якім туга звязвае яна сноп за снапом. Не баяўся я і калючага ржышча, то высокага, дзе зелянеецца трава, бо яго трэба было скасіць на зіму карове (і як яна ела гэткую саламяную цвердзь?), то зусім нізенькага, калі прыходзіў брыгадзір з праверкай і хваліў маму за такую прылежнасць.

Анатоль Бутэвіч. “А я ў Баяры, дамоў хачу...”

15. Варта на імгненне азірнуцца назад -- і ў памяці, нібы ў калейдаскопе, замільгаюць прывідныя абрыўкі і лахманы даўніх падзей і здарэнняў, пачнуць прыпамінацца асобныя выпадкі з дзяцінства і юнацтва, згадвацца эпізоды са сталых гадоў ды складвацца ў адпаведную карціну.

Пачнеш перабіраць жыццёвыя драбніцы, хоць яны былі даўным-даўно, -- і на першы план выплыве родная вёска Купленка, дзе нарадзіўся і вырас, што лепіцца на пагорку, наводдаль ад рачулкі Мясрэды, цераз якую перакінуты вузенькі масток, засланы сасновымі плашкамі.

Па адзін канец вёскі вуліца выходзіла на дарогу, што нырала ў стагадовы сасновы лес і, рассоўваючы яго на бакі, бегла да мястэчка. Местачкоўцы ганарыліся сваёй культурай, тут мелася свая інтэлігенцыя: педагогі, брыгадзіры, рахункаводы. Яны больш дбайна апраналіся і стараліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

размаўляць па-гарадскому, вымаўляючы тутэйшыя архаізмы з чужым акцэнтам, і траплялі часам у надта камічнае становішча.

Васіль Макарэвіч. “Дарогай веку”.

17. Дапаможнік, дапамагчы, цёмны, цемнаваты, вясёлы, весялосць, скараход, вогнетрывалы, бібліёграф, бібліяграфія, радыяграма, радыяхімія, сыграць, зайсці, абысці, выйграць, імклівы, памкнуцца, на льдзіне, ільнозавод, мог узяць, магла ўзяць, фрау, на Урале, кладка, хадзьба, футбол, дзядзька, хаціна, мядзведзь, цюль, раздарожжа, група, праязны, кампосны, агеньчык, маленькі, Скарынавы выданні, Божы суд, алах з ім, рэзюмэ, піке, Іаркшыр, Іаан, на ржышчы, вакол іржышча, завочны, заазёрны, завоблачны.

Святлана Мароз,
Марына Ржавуцкая,
Таццяна Старасценка,
кандыдаты філалагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ